# БАГАТУХА

Увага! Увага! Увага!
Сення восеньскія пасядзелкі.

Мы рады вас бачыць на нашых пасядзелках. Сення будзем весяліцца: спяваць,танцаваць, гуляць, а вас просім нам дапамагаць, калі будзе неабходна.

Са святам сябры мы усіх вас вітаем.
Здароўя, радасці жадаем!

А зараз у залу ўсіх запрашаем: і дарослых, і дзяцей, і шаноўных усіх гасцей.

Гэй, добрыя людзі! Паглядзіце, што у нас будзе.

Сонейка усё ніжай, вецер травы косіць,
Птушкі адлятаюць— наступіла восень.
У жураўліным небе вецер хмары носіць,
Восень наступіла, восень, восень, восень.
Жоўтыя лісточкі, сонца ніжэй сосен.
Восень наступіла, восень, восень, восень.

Штосьці ад бярозы лісце адлятае,
Кажуць на парозе восень залатая.
Мы не заўважылі і самі,
Як восень у госці к нам прыйшла.
З галін пажоўклымі лістамі
Сцяжынкі ў садзе замяла.
Ярка, хораша прыбрала
Усюды дрэвы і кусты.
І зямлю памалявала
У колер жоўта- залаты.

Лятаюць, кружацца рудыя
Над полем ніці павуцін.
Выходзіць восень- гаспадыня,
Стракатым лісцем шамаціць.
Асіна, ліпа, клён, бяроза

Нам дорацъ першыя лісты.
Якое мноства фарбаў розных:
Чырвоных, жоўтых, залатых.

(Слухайце загадку)
Вось мастак, так мастак!
Увесь лес пазалаціў,
Што нават самы моцны дождж
Гэту фарбу не адмыў.

Адгадаць загадку просім:
Хто мастак вось гэты? ВОСЕНЬ!

ВОСЕНЬ! Запрашаем цябе да нас!
(Выходзіць ВОСЕНЬ)

Ой, дзятунькі! Вас вітае ВОСЕНЬ
Вельмі рада я гасцям
Вецер казкі мне прыносіць
Раскажу іх , дзеці, вам.
Вецер яблыні трасе,
Сад пусцее пакрысе.
А пад дрэвамі пасцель.
Грэчка зжата—гола ў полі.
Жыта звезена даўно.

Пуста ў лузе. Толькі стогі
Парыжэлыя стаяць.
Ды шпакі каля дарогі
Цэлы дзень адно крычаць.
_ А чаго ж яны крычаць?

Птушкі адлятаюць, дажджы, туманы, гразь, Холад, дні кароткія. Хіба можна мяне любіць?

Усё гэта дрэнна разумеецца. Але ж колькі ў цябе багацця!

Правільна, мяне іначай яшчэ называюць ВОСЕНЬ- БАГАТУХА.

(Дастае мех, а у ім адгадкі-гародніна. Чытае загадкі. Дзеці адгадваюць. ВОСЕНЬ дастае агародніну. Затым прапануе пагуляць у народную гульню.)

_ Дзеці! У мяне ёсць тры сыны: ВЕРАСЕНЬ, КАСТРЫЧНіК, ЛіСТАПАД.

ВЕРАСЕНЬ даў людзям яблыкі, бульбу. Месяц ВЕРАСЕНЬ халодны, але сыты.

КАСТРЫЧНіК прыносіць доўгія ночы, ачышчае паветра ад розных насякомых.

У КАСТРЫЧНіКУ і хата з дрывамі, і мужык з лапцямі.

ЛіСТАПАД прыносіць холад, змрок, замаразкі.

У ЛіСТАПАДЗЕ кладзі капусту ў кладзі.

Шчыры дзякуй наш прымі
ВОСЕНЬ- ПРАЦАЎНІЦА!
Мы павінны да зямлі
Табе пакланіцца.

ВОСЕНЬ, ВОСЕНЬ! Мы парадуем цябе асеннімі касцюмамі, якія зрабілі дзеці са сваімі бацькамі.

(Паказ касцюмаў).

# МАСЛЕНКА

Добры дзень, сябры! У нас сягодня

МАСЛЕНІЦА! Падыходзьце бліжэй да пудзіла, будзем песні спяваць, жартаваць,

гуляць, танцаваць. МАСЛЕНКА- першае свята вясны. Зіму будзем праганяць, а вясну сустракаць. Любіце вясну?

Зіма не хоча адыходзіць. Будзем да яе падлізвацца, будзем замасліваць. Напячом бліноў, падобных на сонейка, памажам маслам і будзем зіму замасліваць.

Зіма адыдзе, бо сонейка прыпячэ, снег растопіць, птушкі прыляцяць, вясну на крылах прынясуць.

Падыходзьце бліжэй да пудзіла, нясіце смецце, пудзіла запалім і разам смецце спалім. Адыдзе усё дрэннае ад нас, і будзем мы шчаслівымі.

У нас сягоння МАСЛЕНІЦА,
Прыляціць зараз ластавіца.
Сядзе на калу, кіне масла па каму.
А хто ухопіць, так к таму
Шчасце прыйдзе і здароўе.
У нас сягоння МАСЛЕНiЦА!
І хто ж гэта гаспадынька сівая?
Што пярыны выбівае?
Зямлю белым пухам пакрывае?

Правільна, ЗІМА! ЗІМА, падыходзь бліжэй да нас! Зіма, ты надакучыла нам. Пара табе адыходзіць. Ты не крыўдуй на нас. Мы цябе не гонім назаўжды. Але вельмі сумуем па ВЯСНЕ. Хочацца цяпла, пяшчоты, зелені. ВЯСНА, мы чакаем цябе і запрашаем да нас.

Мы ВЯСНУ чакаем, мы ВЯСНУ вітаем, мы ВЯСНУ гукаем: Прыходзь, ВЯСНА!

З ручайком бурлівым, з рэчкай гаманлівай,
З песняй- вяснянкай, з сонейкам уранку.
Прыходзь, ВЯСНА!
( Прыходзіць ВЯСНА і спрачаецца з ЗiМОЙ
Пры дапамозе песень. Ідзе канцэрт ).
А мы МАСЛЕНКУ чакалі
Усю нядзельку выглядалі.
А мы думалі, што МАСЛЕНКА
Сем нядзелек.
Ажно МАСЛЕНКА сем дзянёчкау.

Першы дзень- СУСТРЭЧА, СТРЭЧАННЕ. У гэты дзень МАСЛЕНКУ сустракалі. Будавалі вялікія снежныя горкі, вешалі шугалкі, ставілі сталы з пачастункамі. У гэты дзень дзеці рабілі ляльку. Надзявалі яе і ставілі на відным месцы.

Другі дзень- ЗАЙГРЫШЫ. У гэты дзень хлопцы і дзяўчаты каталіся з горкі, на качэлях, вадзілі карагоды, сустракалі гасцей у варот, абавязкова з блінамі.

Трэці дзень- ЛАКАМКА. У гэты дзень запрашалі зяцёў на бліны. Уся радня ела бліны і хваліла сонейка.

Зяць на двор- пірог на стол.

Прыедзе зяць, дзе смятаны узяць.

Быў у цёшчы, ды рад уцёкшы.

Няма чорта ў доме- прымі зяця.

Чацвёрты дзень- Дзень СВЯТОГА УЛАСА. Масавыя гулянкі, язда на конях з песнямі. У гэты дзень павінен праспяваць першы жаўрук.

Пяты дзень- ЦЁШЧЫНЫ ВЯЧОРКі. Ехалі да цёшчы ў госці зноў і там частаваліся.

Шосты дзень- ЗАЛОУКіНЫ ПАСЯДЗЕЛКі. На рэках моладзь будавала снежную крэпасць, дзяліліся на дзве каманды. Адна каманда штурмавала, а другая абаранялася.

Сёмы дзень- ПРАБАЧАЛЬНЫ. У нядзелю свята завяршалася. Урачыста спальвалі ляльку, а попел рассейвалі па агародзе, каб быў добры ўраджай. У гэты дзень прасілі прабачэння адзін у аднаго. Зварочваліся са словамі:

Прабач мяне Хрыста радзі, калі я ў чым вінаваты перад табой! Прабачэнне завяршалася пацалункам.